Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-02-22

# Паміж Польшчай і Расіяй

**Дзяніс МАРЦІНОВІЧ**

Шматтомны праект «Беларускі кнігазбор» папоўніўся **«Выбраным» Анатоля Грыцкевіча**. Гэта новы, 63-і, том, які выйшаў у зялёнай серыі «гісторыка-культурныя помнікі». Ведаючы пра асобу і творчасць аўтара, з’яўленне «Выбранага» ў рамках серыі выглядае лагічным.




Адзін са старэйшын беларускай гістарыяграфіі (А. Грыцкевіч нарадзіўся ў 1929 годзе), ён пачынаў сваю кар’еру як выпускнік Мінскага медыцынскага ўніверсітэта. Пасля атрымаў адукацыю ў сталічным лінгвістычным інстытуце і на гістарычным факультэце БДУ. Абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі. Працаваў у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук БССР і мінскім Інстытуце культуры. Аўтар больш як 900 навуковых прац, у тым ліку 6 манаграфій.

Аснову новага тома «Кнігазбору» склала гістарычнае даследаванне «Барацьба за Беларусь. 1917 — 1921» (яе першае выданне пабачыла свет у 2008 годзе на рускай мове пад назвай «Заходні фронт РСФСР. 1918 — 1920»). Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў, якім, напэўна, мала вядома пра вайну паміж Савецкай Расіяй і Польшчай 1919 — 1920 гадоў. Аўтары савецкай гісторыі заўсёды вызначалі яе як «паход Антанты», нягледзячы на тое, што рэальная барацьба адбывалася за ўсталяванне новых межаў паміж Расіяй і Польшчай. Паводле аўтара, кніга з’яўляецца «першым сярод даследаванняў савецка-польскай вайны 1919 — 1920 гадоў, дзе ўлічаны дыпламатычныя адносіны таго перыяду, барацьба палітычных сіл у Беларусі і Польшчы, палітычныя дзеянні савецкага расійскага і польскага ўрадаў. Яе асаблівасць — сімпатыя да нацыянальных рухаў у <...> Літве, Беларусі і Украіне».

Кнігазбораўскі том завяршаецца раздзелам «Старонкі гісторыі», дзякуючы якому чытачы змогуць даведацца пра ўніяцкую царкву, славутыя бітвы беларусаў і нават пра дзейнасць янычар у нашай краіне.